СЁННЯ – МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ ВЯЗН

# ВЯЗЕНЬ ГЕТА

Усім вядома, што яўрэі займаліся пераважна гандлем ці рамествамі. Вось і майго бацьку ведалі ў Сінкевічах як добрага каваля. Яго справу пераанялі і старэйшыя браты, адзін працаваў у роднай вёсцы, другі – у Хораставе. А я вучыўся краўцоўскаму майстэрству ў свайго дзядзькі, брата маці, у якога цудоўна шыла ўся сям'я.

Мірным клопатам местачковага насельніцтва перашкодзіла вайна. Некаторы час жылі пад прыгнётам страху, а ў сакавіку 1942 года яўрэяў з навакольных вёсак пазганялі ў Лахвенскае гета. У гэтым была ўсё ж нейкая вызначанасць. Мы дакладна ведалі, што нас збіраюцца знішчыць, а таму адчувалі ўнутраную свабоду. Палохае невядомасць, а тут свядома пачалі рыхтавацца да супраціўлення, літаральна натхніўшыся рускай прымаўкай: паміраць – дык з музыкай.

Лахвенскае гета было размешчана ў цэнтры вёскі, там, дзе цяпер знаходзіцца хлебны магазін. Яно было абнесена калючым дротам. Але нас выводзілі адтуль, калі гналі на розныя работы. Часцей за ўсё адпраўлялі пешшу ў Сінкевічы грузіць калоды.

Пры ўсякім зручным выпадку назапашвалі ў гета гаручыя вадкасці, рэчы, якія маглі выкарыстаць як зброю. І вось калі стараста юдэнрата Берл Лапацін (ён выратаваўся з той трагедыі, але загінуў потым у партызанскім атрадзе) назваў дату знішчэння і мы былі гатовыя даць бой.

Раніцай 3 верасня 1942 года карнікі выйшлі „на работу". Сустрэлі іх імгненна падпаленымі пабудовамі гета. А далей пачалася барацьба амаль рукапашная. З суседам Абрамовічам кінуліся да аднаго з фашыстаў. Янкель забіў яго сякерай, а я захапіў вінтоўку. Карнікам усё ж удалося вывесці да ямкі самых знясіленых яўрэяў і пачаць іх расстрэльваць. Тады мы кінуліся на агароджу, паламалі яе і пабеглі да рэчкі.

Добра ведаючы мясцовасць, схаваліся ў лесе. Ноччу падышлі да цагельні. Там сустрэлі знаёмага селяніна, які параіў перабірацца праз раку, што і зрабілі. Дайшлі да хутара Ваган, схаваліся пад стогам сена. Наступнай ноччу перапаўзлі чыгунку, хаця яна і ахоўвалася , і апынуліся на хутары Стадольнік. Адляжаліся крыху ў стагах сена, а потым зноў пачалі блукаць па лесе, шукаць партызан.

Не хутка, але ўсё ж трапілі на атрад. Некаторыя з нашай групы, якая цудам выратавалася, засталіся ў сямейных лагерах. Тыя ж, хто хацеў працягваць барацьбу, былі расфарміраваны па атрадах. Я стаў партызанам атрада імя Молатава Пінскага злучэння. Пасля вызвалення Беларусі пайшоў у Чырвоную Армію. Закончыў школу сувязістаў у Кіеве, а потым працягваў ваяваць. Пасля Перамогі яшчэ два гады служыў у Германіі. Ведаеце, што ўражвала: мне ніхто з немцаў не верыў, калі расказваў пра трагедыі гета. Фашысты ж не расстрэльвалі яўрэяў у Германіі, вывозілі іх адтуль у тую ж Беларусь і тут знішчалі. Ну, што ж, добра, што хаця цяпер у іх адкрыліся вочы на гэтую жудасную старонку гісторыі.

Як высакародна ўвекавечыць памяць пра загінуўшых на гэтай вялікай вайне? Я застаўся жывым, але ўсе мае родныя загінулі. А ў нас была вялікая сям'я, маці нараджала 16 раз, але выжылі толькі шасцёра дзяцей: тры сястры і тры браты. Спадзяюся, што іх імёны таксама будуць занесены ў Кнігу „Памяць".

**КІРЗНЕР Невах,** жонка **Хая,** дочкі **Эстэр** з двума дзецьмі, **Фрэйдл** – з шасцярыма, **Бася** – з адным, іх мужы, родам двое з Кажан-Гарадка і адзін – з Пінска, былі прызваны ў Чырвоную Армію ў першыя дні вайны і таксама не вярнуліся.

Мае двое братоў, **Алтэр** і **Эля,** таксама загінулі на фронце.

**ГОЛУБ Рахміэл,** мой дзядзька, мой настаўнік, стаў ахвярай Лахвенскага гета разам з сям'ёю: жонка **Хая,** дочкі **Бася** і **Эшка,** сын **Эля** са сваёю жонкай і двума дзецьмі.

**ГОЛУБ Лейзер,** другі дзядзька, загінуў у гета ў Мікашэвічах разам з жонкай **Фрыдай,** сынам **Мішай,** дачкой **Эстэр** і нованароджаным.

Вярнуўшыся з вайны, убачыў толькі папялішча роднага дома. Ажаніўся ў Лунінцы, але працаваць ездзіў у Сінкевічы. Дагэтуль займаюся кравецкай справай, маючы ўжо 47 год працоўнага стажу. І балюча, і горка ўспамінаць падзеі 50-гадовай даўніны, але неабходна. Тыя, каго памятаем, жывыя ў нашых сэрцах.

**Мэпшэль Невахавіч КІРЗНЕР.**

г. Лунінец.